# УСПАМІНЫ ЖЫХАРА ВЁСКІ ПАДБАГОНІКІ ЛЕАНІДА РАМАНАВІЧА САЛАЎЯ

… Людзі старэйшага пакалення памятаюць той страшны час, калі на нашу красуючую зямлю ступіў бот чужынца...

Чэрвень 41-га… Хваля фронту пакацілася далей на ўсход, а за ёю прыйшлі да нас фашысцкія тылавікі, пачалі наводзіць свой «новы» парадак. Кожны дзень гучалі жудасныя стрэлы. Гінулі салдаты-акружэнцы, іх не бралі ў палон, расстрэльвалі. Жыццё местачковых яўрэяў было для фашыстаў не каштоўней за жыццё мух. Хутка ўзяліся і за жыхароў вёсак. Найперш распраўляліся з тымі, хто да вайны займаў у калгасе нейкую пасаду ды і проста з калгаснікамі ці з былымі дэпутатамі.

Хапалі ў хатах, на сельскіх вуліцах, а то і проста на дарогах. Так загінуў жыхар вёскі Алекшыцы Антон Міськевіч (па-вясковаму Антось Бараноўскі), якога расстралялі ля шашы непадалёку вёскі Петраўцы. А направа, у невялікім бярэзнічку, былі расстраляны мужчыны з вёскі Кавалі. Такі ж лёс сустрэў і многіх жыхароў вёсак Сямёнаўка, Кудрычы, Канюхі, Каменка і іншых, не кажучы пра мужчын з Верхаўлян, якія ўсе былі расстраляны фашыстамі, а сама вёска спалена. Хапалі не толькі мужчын, але і жанчын, не літавалі і дзяцей...

Неяк чэрвенскім ранкам на вуліцы нашых Падбагонікаў з'явіліся гестапаўцы. Загадалі выйсці з хатаў усім мужчынам, і афіцэр, які трымаў у руцэ нейкую паперу, паклікаў да сябе намесніка вясковага солтыса (солтысам на дзве вёскі быў чалавек з Пыхоўчыцаў). Той, дрыжачы ад страху, падыйшоў. Афіцэр накіраваўся да нашай хаты. Зазірнуў у паперу. І бацьку гестапаўцы загадалі сядаць у кузаў грузавіка, а самі пайшлі далей. У той раз, уключаючы бацьку, былі арыштаваны сёмера мужчын: Раман Салавей, Міхась Лашэвіч, Ёзік Лукашык, Іван Граеўскі, Сяргей Станіслаўчык, Раман Станіслаўчык, яшчэ адзін Ёзік Лукашык. Калі прыйшлі арыштоўваць Ёзіка Максімавіча Лукашыка, высветлілася, што ў вёсцы два Ёзікі, якія носяць адно прозвішча. Імя па бацьку ў спісе, складзеным на польскай мове, не было, і года нараджэння таксама. Гестапаўцы не сталі разбірацца: забралі абодвух мужчын.

Мы, радня арыштаваных, паспешна сабралі ў торбачкі ежу – па кавалачку сала і хлеб.

Нехта з машыны крыкнуў: «Тытуню!» Колькі знайшлі яго спехам - перадалі. Машына рушыла ў напрамку Алекшыцаў.

І пацяклі дні страшнай невядомасці…

Куды ж павезлі нашых родных? Гэта я спрабаваў даведацца, ездзячы на веласіпедзе ў Вялікую Бераставіцу і нават у Гродна, дзе праз сваякоў спрабаваў што - небудзь пачуць. Але ўсё безвынікова...

Маці плакала - галасіла пяцёра сутак. На шостыя, ноччу, нехта пастукаў у дзверы. Адчынілі - бацька. Стомлены, знясілены, страшны на выгляд. Высветлілася, іх адразу павезлі ў Ваўкавыск. Загналі ў нейкі цагляны хлеў, дзе ўжо былі двое арыштаваных. Прайшлі суткі, другія, трэція,

чацвёртыя... Мужчыны даўно з'елі ўвесь свой правіянт, ежу зрэдку прыносілі некаторыя жыхары Ваўкавыска. І вось, перад заходам сонца, фашысты падагналі грузавік. У кузаве яго - лапаты. Збоку машыны стаялі салдаты, якія пачалі крычаць: «Шнэль! Шнэль!» і гумовымі кійкамі заганяць мужчын у кузаў. Мужчыны змікіцілі: павязуць на расстрэл. Мой бацька быў самы старэйшы, ваяваў яшчэ ў першую сусветную вайну, з першага яе дня да апошняга быў разведчыкам палка і не раз глядзеў смерці ў вочы.

«Каго вы расстрэльваеце?! Людзей ад касы і ад плуга! Хто ж будзе на зямлі працаваць?» - крыкнуў ён. Перакладчык, па знаку афіцэра, перавёў яго словы. Бацька дадаў, што адзін з мужчын арыштаваны не па спіску, а па падобнасці прозвішча і імя.

Афіцэр даў каманду злезці з машыны. Потым пачаліся допыты. Іх прымушалі прызнацца, што яны камуністы ці працавалі ў «НКВД», Міхась жа Лашэвіч быццам бы быў старшынёй калгаса. Дапытвалі доўга, з нямецкай педантычнасцю. Нічога не дабіўшыся, вымушаны былі адпусціць: фашыстам сапраўды былі патрэбны працаўнікі на зямлі.

З Ваўкавыска мужчыны ішлі пешшу. «Гэта Бог дапамог вам,» - цвярдзіла маці, бо ніхто не спадзяваўся ўбачыць іх жывымі.

Але бацька мой усё ж фашысцкіх зачыстак не пазбегнуў: у 1942 годзе яго арыштавалі і кінулі ў Беластоцкую турму. Адтуль вывезлі ў канцэнтрацыйны лагер Штутгоф, дзе бацька і загінуў. На фронце склаў галаву і Іван Граеўскі...

Вайна прынесла гора ў кожную нашу вясковую сям'ю. І таму галоўнае, што мы, ветэраны вайны і працы, жадаем сваім унукам і праўнукам - гэта мірнага неба над галавой.

Запісаў Мікалай Пацэнка, в. Падбагонікі,
2010 год.